Гардзееў Б.

# ПІСЬМО З СОРАК ДРУГОГА

Гэта было летам 1963 года. Поездам Ленінград–Днепрапятроўск я вяртаўся з горада Леніна дамоў, у Магілёў. Маёй суседкай па купэ аказалася старэнькая жанчына, якая назвала сябе Марыяй Георгіеўнай Нікольскай. Яна ехала ў Бабруйск.

– Неадольна пацягнула да сябе родная зямля, успаміны дзяцінства і маладосці, – загаварыла яна, калі поезд крануўся ў свой няблізкі шлях.

– Магілам родных і блізкіх трэба пакланіцца, пакуль ёсць сілы. Восьмы дзесятак жа даўно размяняла. Еду ў апошні раз, відаць...

Адкінулася да сценкі, доўга маўчала.

– Адна-адным засталася, – цяжка ўздыхнуўшы, зноў загаварыла. – А была сям’я: дрве дачкі, зяць, унук і ўнучка. Усіх вайна адабрала. Дзе іх магілы? Не ведаю. І ніхто не ведае...

Змоўкла. Можа, думала: ці расказваць незнаёмаму чалавеку пра сваю смуту і гора.

Мяне ж зацікавіла гісторыя гэтай жанчыны.

Марыя Георгіеўна была настаўніцай у Бабруйску. Уладзімір Дзямідавіч, яе муж, працаваў дзесятнікам на лесасплаве. Восенню 1921 года не стала мужа. Старэйшая дачка выйшла замуж за камандзіра Чырвонай Арміі – Івана Ермака. Праз год у маладой сям’і нарадзіўся сын, якога ў гонар дзеда назвалі Уладзімірам. Усю сваю любоў Марыя Георгіеўна аддавала цяпер унуку. Пазней сям’я дачкі пераехала ў Ленінград.

У першыя дні вайны Марыя Георгіеўна выехала з Мінска ў Саратаў. Спынілася ў дваюраднага брата. Малодшая дачка і зяць з унучкай павінны былі эвакуіравацца на ўсход разам з калектывам прадпрыемства. З таго часу яна іх не бачыла. Толькі пасля вайны некалькі рабочых завода сцвярджалі, што родныя ёй людзі загінулі ў час бамбёжкі эшалона дзесьці пад Оршай.

– Пісала я ў Ленінград, да старэйшай дачкі, у Бугуруслан, дзе знаходзіліся ўсе даныя аб эвакуіраваных на ўсход савецкіх людзях, – пад роўны перастук колаў гаварыла Марыя Георгіеўна, – але ніводнага суцяшальнага адказу не атрымала. І раптам перад самым святам Кастрычніка паштальён прынёс мне дарагі падарунак – армейскі трохкутнік ад унука Валодзі.

Жанчына ўзяла сумачку і выцягнула з яе беражліва загорнутае ў кавалак кляёнкі дарагое пісьмо. Чатыры аркушы са сшытка, спісаныя хімічным алоўкам, чыталіся і перачытваліся, бачна, не адзін дзесятак разоў. Выцвіў тэкст. Сцёрліся некаторыя словы. З дазволу Марыі Георгіеўны я перапісаў гэта пісьмо ў свой блакнот.

Вось гэта салдацкае пісьмо з 42-га года:

"28 кастрычнікб 1942 г.

Мілая, дарагая мая бабуля Марыя! Як я рады, што ты жывая і здаровая. Твой адрас, які я сёння атрымаў, мяне вельмі абрадаваў. Адразу хачу падзяліцца з табой яшчэ адной радасцю: у час ранішняга пастраення я прыняў прысягу не вернасць Радзіме. Я стаў паўнапраўным воінам і з нецярпеннем чакаю, калі мяне накіруюць на фронт.

Але ўсё па парадку. Калі ты паехала ад нас у Мінск і праз некалькі дзён пачалася вайна, мы з мамай вельмі хваляваліся. Потым прыйшло тваё пісьмо аб эвакуацыі. Больш нічога мы ад вас не атрымлівалі. Саратаўскі адрас дзесьці згубіўся. Знайсці цябе мне дапамагло адраснае бюро.

Дык вось, калі пачалася вайна, я разам з хлопцамі са школы кожны дзень хадзіў у ваенкамат, але нас у Чырвоную Армію не бралі. У апалчэнне таксама не запісвалі. Калі ж мы ўсім надакучылі, нас залічылі ў гарадскі проціпажарны полк, дзе мяне назначылі камсоргам роты...

Мілая, дарагая бабуля! Даруй ты мне, калі ласка. Не хацеў я цябе засмучаць дрэннымі весткамі. Але нічога не зробіш. Ты павінна ведаць аб смерці мамы. У наш дом трапіла бомба. Маму выратавалі. Але яна цяжка хварэла. Яе трэба было эвакуіраваць, але без мяне яна не хацела ехаць. Тады адпусцілі мяне. Па лёдзе Ладагі нас вывезлі з Ленінграда. Гэта было ў студзені. А памерла яна ў чэрвені, ужо на Урале. Калі б ты ведала, колькі я перабачыў гора, пакут, смерцяў! Усё гэта прынеслі на нашу зямлю фашысты.

Мілая бабуля! Як і дзе жывуць цётка Дуся, дзядзька Мікалай і Марышка? Няўжо яны засталіся на акупіраванай тэрыторыі? Прашу цябе: беражы сябе. За мяне не турбуйся. Я не пасаромлю памяці бацькі і маці. Адпомшчу фашыстам за смерць мамы. Я дайду да Берліна! А калі спатрэбіцца, я не пашкадую свайго жыцця дзеля свабоды нашай Вялікай Айчыны.

Я моцна цябе абдымаю і цалую. На гэту палявую пошту мне не пішы. Хутка прышлю новы нумар. Не сумуй. Пасля вайны мы з табой яшчэ не раз з'ездзім у наш Бабруйск, пабываем у Мінску. А жыць будзем у Ленінградзе. У горедзе Леніна і рэвалюцыі. Як я яго люблю!

Твой унук Валодзя".

Гэта пісьмо было для Марыі Георгіеўны першым і апошнім.

– Пасля вайны я пасялілася ў Ленінградзе, – сказала ў заключэнне жанчына і чакала, чакала...

Я, вядома, паспачуваў гору. Вялікаму гору. Бо замест сям’і, пастаянных клопатаў аб дзецях і ўнуках у яе засталіся боль і адзінота ў старасці.

У тыя дні я, вядома, не мог нават уявіць, што менш чым праз два гады давядзецца па архіўных дакументах прасачыць за далейшым лёсам аўтара пісьма 42-га года...

Ішоў 1965 год. Па просьбе таварышаў з савета ветэранаў 60-й арміі, у саставе якой я ўдзельнічаў у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на Варонежскім фронце, мне неабходна было пабываць у г. Падольску, у архіве Міністэрстэа абароны. Гартаю аднойчы справу з матэрыяламі да Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 21 лютага 1944 года аб прысваенні звання Героя Сааецкага Саюза салдатам, афіцэрам і генералам Савецкай Арміі... Раптам кінулася ў вочы: "Ермаку Уладзіміру Іванавічу – радавому 86-й стралковай дывізіі (пасмяротна)". І адразу ж успомніўся расказ М. Г. Нікольскай. Між тым і падумалася: ці не той гэта чалавек, якога яна чакае вось ужо 20 год?

Адказ на гэта пытанне я атрымаў, калі азнаёміўся з узнагародным лістом У. І. Ермака і архіўнымі дакументамі 86-й стралковай дывізіі.

Так, гэта быў іменна той васемнаццацігадовы Валодзя Ермак, які пісаў у сваім адзіным пісьме да бабулі, што "не пашкадуе свайго жыцця дзеля свабоды нашай Вялікай Айчыны". Напісаў ён гэта не для чырвонага слоўца!

...Радавы У. І. Ермак у лістападзе 1942 года ў складзе маршавай роты прыбыў на Ленінградскі фронт. З 12 па 18 студзеня 1943 года ўдзельнічаў у баях па прарыву блакады Ленінграда ля рабочага пасёлка № 5, праявіўшы пры гэтым "прыкладную мужнасць і адвагу". 19 ліпеня 1943 года ў час разведкі боем на Сінявінскіх вышынях ён паўтарыў бессмяротны подзвіг Аляксандра Матросава – закрыў сваім целам амбразуру варожага дота, "забяспечыўшы поўны поспех баявой аперацыі".

На жаль, пра ўсё гэта Марыя Георгіеўна Нікольская так і не даведалася. Маё пісьмо ў Ленінград вярнулася назад. Яе паездка ў 1963 годзе ў Бабруйск была сапраўды апошняй...

Аб подзвігу героя-земляка намнога пазней мною быў напісаны нарыс, які ўбачыў свет на паласе "Магілёўскай праўды". Аднак партрэт У. І. Ермака адсутнічае ў алеі Герояў Савецкага Саюза – магіляўчан. Звесткі аб ім не былі ўключаны і ў буклет "Героі Савецкага Саюза – ураджэнцы Магілёўшчыны", выдадзены да 40-годдзя Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй.

Узнікае, натуральна, пытанне: чаму? Справа тлумачыцца проста. У Беларускай Савецкай Энцыклапедыі і больш позні́м энцыклапедычным выданні "Навечна ў сэрцы народным" Герой Савецкага Саюза Ермак Уладзімір Іванавіч значыцца ўраджэнцам горада Мінска.

Матэрыялы пра Герояў Савецкага Саюза рэдакцыя БСЭ рыхтавала, абапіраючыся на звесткі ўзнагародных лістоў. У параграфе 12-м гэтага дакумента "Пастаянны хатні адрас прадстаўляемага да ўзнагароды і адрас яго сям'і у У. І. Ермака быў указаны адрас бабулі і цёткі ў Мінску. Іншага адрасу ён не мог запісаць ні ў чырвонаармейскай кніжцы, ні ў медальёне: у Ленінградзе і ў Бабруйску ў яго ўжо нікога не было.

Але... адрас сям'і і месца нараджэння – не адно і тое ж паняцце.

Устанавіць ісціну дапамаглі мае запісы з архіва аб баявой дзейнасці 86-й стралковай дывізіі, пісьмо самога героя і іншыя дакументы. Рэдакцыя БСЭ выправіла дапушчаную памылку. У энцыклапедычным выданні "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць". (Мн., БСЭ, 1986) на стар. 113 публікуецца даведка аб тым, што г. Бабруйск з'яўляецца радзімай Ермака Уладзіміра Іванавіча. Далей гаворыцца, што "Герой Савецкага Саюза У. І. Ермак нарадзіўся 15.5.1924 г. у сям'і ваеннаслужачага... У 1929 годзе пераехаў з бацькамі ў Ленінград...".

Цяпер бабруйчане могуць з поўным правам лічыць Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Іванавіча Ермака ўраджэнцам і земляком. Думаю, што яны ўвекавечаць яго памяць, на яго беззапаветным подзвігу будуць выхоўваць новых патрыётаў сацыялістычнай Радзімы.

**Гардзееў, Б. Пісьмо з сорак другога / Б. Гардзееў // Магілёўская праўда. — 1987. — 16 мая. — С. 4.**